У.У.Трамбіцкі
(кафедра філасофіі)

# ПРАЦОЎНАЯ ТВОРЧАСЦЬ - АСНОВА РАЗВІЦЦЯ ГРАМАДСТВА І АСОБЫ

Развіццё чалавека выяўляецца ў творчасці. У творчасці чалавек рэалізуе сваё жыццё, раскрывае свае істотныя сілы, фарміруецца як асоба. У сістэме творчасці ў якасці асноўнага элемента выступае працоўная творчасць. Таму ў гэтым артыкуле я зраблю спробу паказаць уплыў творчасці наогул і асабліва працоўнай творчасці на развіццё чалавека і грамадства.

Творчасць - адзін з важных элементаў актыўнасці чалавека, які мае грамадскае паходжанне і прагрэсіўную значнасць для чалавека і грамадства. Творчасць - паняцце, у якім адлюстроўваецца дзейнасць чалавека па стварэнню новых аб'ектаў, якія выражаюць ступені развіцця чалавека і грамадства. Прагрэсіўнае значэнне творчасці залежыць не толькі ад тварца, але і ад грамадскіх адносін у якіх дзейнічаюць суб'ект творчасці і вынікі яго творчасці.

У творчасці выяўляецца еднасць аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў. У сучаснай філасофіі існуюць такія падходы пры тлумачэнні асобы, якія не улічваюць аб'ектыўных фактараў, якія акязваюць уплыў на дзейнасць асобы. У такім выпадку, як падмеціў Е.А.Ануфрыеў: "... проблема личности переводится из сферы социально-политической в сферу индивидуальную. Социальный статус человека в обществе ставится в зависимость не от общественных отношений, а от личных качеств человека. Отсюда следует, что тот, кто находится на низшей ступени социальной лестницы, подвергается социальной или расовой дискриминации, должен относить вину за это на собственный счет, а не на счет социального строя общества"[1].

Амерыканскія філосафы Г.Ласвелл і Б.Барбер лічаць, што цэннасці асобы, месца асобы у грамадстве залежаць ад асабістай актыўнасці. Таму кожны чалавек можа дасягнуць поспеху, а калі чалавек не дасягае поспеху - гэта вынік асабістых рысаў характара асобы. Можна згадзіцца з тым, што суб'ектыўныя якасці аказва-

юць уплыў на яе дзейнасць. Калі не улічваць аб'ектыўныя фактары, грамадскія адносіны, то падыход да трактоўкі месца асобы ў грамадстве будзе аднабокім.

У сістэме грамадскай актыўнасці, творчасці, працоўная творчасць выступае ў еднасці аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў. Суб'ектыўнае ў творчасці займае вялікае значэнне.

У працоўнай актыўнасці закладываюцца асновы развіцця асобы і прагрэсу грамадства. Існуюць пункты гледжання, што паняцці грамадскай актыўнасці і творчай дзейнасці з'яўляюцца тоеснымі. Можна згадзіцца з тым, што памылкова лічыць любую актыўнасць творчай, таму што актыўнасць па разбурэнню маральных і матэрыяльных каштоўнасцей з'яўляецца варварствам. "Творчасць" варвараў, як правіла, мае адмоўную значымасць для акружаючых. Яна з'яўляецца творчасцю толькі ў суб'ектыўных уяўленнях варвараў.

Працоўная дзейнасць вызываецца да жыцця многімі фактарамі. Сярод апошніх можна выдзеліць патрэбнасці, інтарэсы, здольнасці, каштоўнасці. Сама па сабе працоўная актыўнасць не існуе без матывацый, без грамадскіх механізмаў рэгулявання узаемаадносін паміж асобай і грамадствам.

Што датычыць грамадскіх механізмаў рэгулявання працоўнай актыўнасці асобы, то яны заўседы носяць канкрэтна-гістарычны характар. Але адны і тыя ж грамадскія адносіны могуць па-рознаму і успрынімацца людзьмі. Тут уся справа ў суб'ектыўнай матывацыі.

У працоўнай творчасці ілюстроўваецца узаемадзеянне грамадскага і асабістага. У свой час аб гэтым пісаў К.Маркс у "Экономическо-философских рукописях 1844 года", апісваючы праблему адчужальнасці. Гэта праблема разглядалася К.Марксам і ў доктарскай дысертацыі, а ў "Критике гегелевской философии права" К.Маркс ужо не згодзен з трактоўкай анталагічнага адчуджэння Гегеля і думкамі паслядоўнікамі Гегеля, якія рэальныя працэсы праваблалі звесці да самаадчуджэння свядомасці. Уклад К.Маркса ў названую тэму апісаны ў савецкай філасофскай літаратуры.

Да нядаўняга часу лічылася, што фенамен адчужальнасці з'яўляецца спадарожнікам толькі капіталістычнага спосабу вытворчасці. Калі размова ідзе аб культе асобы ці застоі, то нельга не бачыць іх адмоўнага уплыву на асобу.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пра існаванне адчужальнасці у нашым грамадстве гавораць многія сацыялагічныя апытанні. Калі узяць, напрыклад, сферу размеркавання, то яшчэ да распаду Савецкага Саюзу, 60 працэнтаў рабочых і калгаснікаў (ад апытаных) сумняваліся, што паляпшэнне іх працы акажа уплыў на павялічэнне іх заробатка, толькі 37 працэнтаў лічылі, што пагаршэнне работы прывядзе да памяншэння размераў заробатка, 70 працэнтаў звязвалі поспехі або недахопы у дзейнасці калектываў з сваім матэрыяльным становішчам. Тут можна згадзіцца з Ю.А.Тіхаміравым, які лічыць, што "В течение долгих лет из-за уравниловки в оплате труда ослабились стимулы трудовой деятельности, а ее результаты не связывались с оплатой. Часть людей привыкла на общественную собственность, фонды поощрения смотреть как на "ничейные". Но ведь труд - начало всего, без него мертва экономика и нет прогресса".

Феномен адчужальнасці пры сацыялізме у СССР праявіўся не толькі у працоўнай, але і у палітычнай, прававаой і маральнай сферах. Хто павінен у тым, што сацыялізм у СССР стаў рэальнасцю? Мне здаецца, што асноўнай прычынай з'яўляецца некампетэнтнае ужыванне у грамадскія працэсы упраўленцаў, якія за свае кіруючыя указанні не неслі ніякай адказнасці за прынятыя пастановы. Вось чаму прагрэс грамадства і асобы можна звязваць толькі з ростам прафесійнасці і адказнасці за вынікі сваей дзейнасці. У ходзе грамадскага развіцця узрастае залежнасць грамадства ад вынікаў сваей дзейнасці. Дэфармацыі сацыялізму аказвалі уплыў не толькі на суб'екта працоўнай актыўнасці. Адчужальнасць выявілася у многіх грамадскіх адносінах.

У працоўнай сферы адчужальнасць асобы выявілася у першую чаргу, у адчужальнасці ад грамадскай уласнасці на сродкі вытворчасці. Далёка не кожны чалавек меў і мае аднолькавыя. З'яўляючыся вядучымі у сістэме вытворчых адносін, адносіны да уласнасці не маглі не аказваць уплыў на усе другія элементы вытворчых адносін і на узровень вытворчых сіл (у першую чаргу на чалавека).

Пераадольванне адчуджальнай працы - неабходная умова узвышэння працоўнай творчасці, пераадольванне адчуджальнасці у другіх сферах творчасці. Пераадольванне адчуджальнасці - крок у напрамку змянення месца чалавека не толькі у сістэме вытворчых адносін, не толькі у сістэме грамадскага кіравання, але і змянення статуса асобы, аб'екта грамадскага прагрэсу. У грамадскі

прагрэс уваходзяць навучны і тэхнічны прагрэсы. Апошнія аказваюць уплыў на развіцце тэхнікі і тэхналогіі. Тэхніка (асабліва ў перыяды навукова-тэхнічных рэвалюцый) аказвае уплыў на працоўную актыўнасць чалавека. Гэты уплыў носіць дваякі характар, станоўчы і адмоўны. Станоўчае ўздзеянне тэхнікі і тэхналогіі вызначаецца ў тым, што яна здольна вызваліць чалавека ад цяжкай і малакваліфікацыйнай працы, здольна даць чалавеку вольны час, які ен можа выкарыстаць для свайго развіцця. Прапанаваная схема развіцця тэхнікі і тэхналогіі на чалавека ў многім яшчэ залежыць ад палітычнага і эканамічнага развіцця той або іншай краіны. Тэхналагічная перабудова эканомікі часта вядзе да беспрацоўя. Так у канцы прошлага дзесяцігоддзя у ЗША было 8 млн. поўнасцю беспрацоўных, а ў Канадзе было зарэгістравана 11,2 працэнта беспрацоўных ад усяго працаздольнага насельніцтва. Да нядаўняга часу гэты працэс аднабокава адлюстроўваўся ў філасофскай літаратуры. Толькі ў канцы прошлага дзесяцігоддзя з'явіліся данныя аб беспрацоўі і ў некаторых рэгіенах СССР. Напрыклад, у саюзных і аўтаномных рэспубліках Сярэдняй Азіі, Закаўказзя і Паўночнага Каўказа частка незанятага ў грамадскай гаспадарцы насельніцтва ў працаздольным узросце складала ў Азербайджанскай ССР - 27,6 працэнтаў, ў Таджыкскай ССР - 25,7 працэнтаў, Узбекскай ССР - 22,8 працэнтаў, Туркменскай ССР - 18,8 працэнтаў, Дагестанскай АССР - 18,8 працэнтаў.

Больш таго, аналіз няшчасных выпадкаў, парушэнняў у рабоце лічыльных механізмаў гаворыць аб тым, што вялікая колькасць няшчасных выпадкаў здараецца з-за тэхнікі і тэхналогіі, з-за памылак, якія робіць чалавек. Так па даным статыстыкі ЗША, названай прычыне было да 70 працэнтаў летных здарэнняў, больш 50 працэнтаў адказаў розных установак, больш 60 працэнтаў здарэнняў у флоце, па швейцарскім даным, больш 30 працэнтаў няшчасных выпадкаў у прамысловасці таксама узнікае з-за памылак, якія робяць працоўныя пры упраўленні тэхнікай.

Прагрэс тэхнікі і тэхналогіі ўплывае на змест працы і на характар працы. Змест працы вызначаецца ўзроўнем развіцця сродкаў працы і працоўнай сілай чалавека. Узровень развіцця тэхнікі і тэхналогіі аказвае уплыў на грамадскія і прафесійныя раздзелы працы, суадносіны фізічнай і разумовай працы, высокакваліфікацыйнай і малакваліфікацыйнай працы. Змяненне зместа



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працы адлюстроўвае вылектыку грамадскіх і асабістых інтарэсаў і патрабаванняў, адлюстроўвае рост кваліфікацыі людзей працы, а ў сваю чаргу садзейнічае развіццю творчых элементаў у працы.

Прагрэс тэхнікі і тэхналогіі адлюстроўваецца і на характары працы. Ад спосабу злучэння рабочай сілы з сродкамі вытворчасці, ад грамадска-эканамічнай істотнасці працы залежыць месца чалавека ў сістэме грамадскай вытворчасці. Характар працы чалавека вызначае метады прыцягнення людзей да працы, вытворчыя адносіны, характар прысвойвання вынікаў працы.

Развіццё тэхнікі і тэхналогіі выступае як працэс, які сведчыць аб павелічэнні ступені ўздзеяння чалавека на прыроду, як працэс павелічэння сілы рук і разуму чалавека, сілу вачэй і т.д. чалавека. Аднак, павелічэнне магутнасці чалавека ў гэтых адносінах прыводзіць да так званых глабальных праблем сучаснасці.

Грамадскі прагрэс і прагрэс чалавека немагчымы без развіцця тэхнікі і тэхналогіі. Пры укараненні апошніх у практыку неабходна ўдзяляць увагу ў першую чаргу грамадскай сферы. Пры такім падыходзе трэба каб спачатку развіваліся не новыя гіганты-пабудовы, а после умовы для жыцця людзей, а наадварот. Пры такім падыходзе навучна-тэхнічны прагрэс будзе насіць гуманістычны характар. Такі падыход мяняе месца чалавека ў сістэме вытворчасці. Тут чалавек разглядаецца не як аб'ект грамадскага прагрэсу, а як суб'ект. Гэта цывілізаваны падыход да навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Пры грамадскай уласнасці на сродкі вытворчасці, пры дэфармiраваным сацыялізме чалавек адчуваў сябе не гаспадаром вытворчасці, а выканаўцам некаторых функцый ў сістэме вытворчасці. Такое месца чалавека аказвае ўплыў і на тэхніку і на тэхналогію, і на рост прадукцыйнасці працы.

Да нядаўняга часу арганізатары вытворчасці не былі зацікаўлены ў новай тэхніцы і тэхналогіі. Такое становішча прыводзіла да таго, што ў народнай гаспадарцы ручной працай было занята каля 40 працэнтаў працоўных прамысловасці, больш 35 працэнтаў рабочых будаўнікоў, 2/3 сельска-гаспадарчых працаўнікоў.

Самая новая тэхніка і тэхналогія сама па сабе не можа зрабіць з чалавека адчужальнага ад зямлі, ад сродкаў вытворчасці, ад вынікаў сваей працы ў гаспадары вытворчасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"Оказалось, что до тех пор, пока люди ощущают себя поденщиками, отчуждены от земли, не имеют права планировать свой труд, распоряжаться его результатами, новая техника не меняет дела. Сама по себе она не стимулирует ни инициативу, не профессиональное совершенство, ни бережливость. Надежды начала двадцатых на тысячи тракторов, в которые верили как в партию, в состоянии переломить судьбу русской деревни, себя не оправдали... В некоторых наших областях сегодня на круг меньше собирают зерна, чем до революции".

Старыя формы сацыялістычных вытворчых адносін, сфарміраваныя ў 30-е гады скора выгарналі сябе, таму што яны былі разлічаны на сістэму такіх стымулаў, якія не ўзвышалі чалавека працы.

Навязванне чалавеку працы свайго апякунства з боку адміністрацыйна-каманднай сістэмы кіравання стрымлівала творчыя адносіны да працы, пад выглядам калектыўнай працы часта хавала агульную безадказнасць. Рэгуляванне працоўнай актыўнасці ўраўнаваннем у заработнай плаце, удасканальванне эканомікі "на маральных парывах душы", не з'яўлялася стымулам працоўнай актыўнасці і працоўнай творчасці. Ураўніл аўка выкарыстоўвалася ў якасці апраўдальнай ідэалогіі для лянівага работніка: "Человеку вообще свойственно связывать свои надежды с тем, что у него нет и что есть у других, и недооценивать то, чем он сам обладает. Наверное, по этой причине мы чрезвычайно увлекались мечтами о могуществе техники, стали возлагать большие надежды на новые трактора и механизмы, и одновременно, не испытывая ни сожаления, ни мук совести, истребили породу хозяйственных крестьян, тех, кто был привязан к своей земле, кто хотел и умел работать".

Гэта не магло не аказаць уплыў на грамадскую і на індывідуальную свядомасць. Адчуждальнасць у сферы працоўнай актыўнасці пранікала ў усе ўзроўні і віды грамадскай свядомасці, стварала супярэчнасці паміж індывідуальнай і грамадскай свядомасцю. Назіралася адчужэнне чалавека ад сваей грамадскай істоты, што вяло да ўзнікнення такіх грамадска-псіхалагічных рысаў асобы як канфармізм, збаўленне творчай актыўнасці, некрытычнасць і маналагічнасць, паслабленне волі, неабходнасць у знешнім кантролі. Вось асноўныя прычыны, якія вялі да ўзнікнення такой індывідуальнай свядомасці, якая мела наступныя якасці: адчуванне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асвядомленага або неасвядомленага пратэсту супраць існуючых адносін у грамадстве, адчуджальнасць грамадскіх каштоўнасцей, недавер да грамадскіх ідэалаў, бездухоўнасць і раўнадушнасць да грамадскіх праблем. У сістэме інтарэсаў асобы пачынаюць дамініраваць эгаістычныя інтарэсы.

У грамадстве ўзнікаюць рухі і арганізацыі, драматычна складваюцца лесы людзей, у якіх абвастраецца пачуцце адказнасці. У такой абстаноўцы пачынаецца перабудова, з'яўляюцца кааператывы. Шлях кааператываў у сучаснае жыццё аказаўся складаным. Ужо за 1988 год больш ста тысяч кааператываў (столькі не было зарэгістравана, але яны не працавалі) стварылі прадукцыі і аказалі паслуг на 6 млрд.руб. Толькі за першы квартал 1990 года – ужо на 4 млрд.руб. На паўмільена за той жа квартал павялічылася колькасць працуючых у кааператывах, а 1 красавіка працуючых у кааператывах было больш за 2 млн. чалавек. Недавер да кааператываў можна растлумачыць тым, што многія з іх займаліся не вытворчасцю тавараў, а спекуляцыяй. Другая прычына, якая выклікала адмоўныя адносіны да кааператываў, заключалася ў высокай цане на кааператыўныя тавары. "Но мало кто знает, что сырье и материалы кооперативам продаются с многократной наценкой, доходящей до 600 процентов. Подзаконный акт, родившийся в недрах Минфина и Госкомцен, уже с самого начала закладывает высокие цены на продукцию и озлобление населения". Падобныя адносіны ў многіх людзей дапераду малых прадпрыемстваў, якія самі нічога не ствараюць, а займаюцца толькі перапродажам.

Узвышэнне асобы, пераадольванне адчуджальнасці, удасканаленне вытворчых адносін магчыма толькі тады, калі чалавек працы будзе з'яўляцца не толькі выканаўцам у сістэме грамадскіх адносін, а гаспадаром вынікаў сваёй працы. Такія змяненні ў грамадскіх адносінах ажыццяўляюцца дзякуючы асвайванні ўжо вядомых форм уласнасці: кааперацыі, сямейнага падраду, арэнды. Толькі ў РСФСР у пачатку 1989 года ў сельскай гаспадарцы на арэнду перайшло каля 70 тыс. (20 працэнтаў) прадпрыемстваў. Нягледзячы на асвойванне новых форм уласнасці ў канцы васьмідзесятых гадоў быў адрыў аплаты працы ад росту прадукцыйнасці працы, што вяло да "проедания" атрыманага ў грамадскай вытворчасці дабытку. У 1965 г. фонд аплаты працы ў калгасаў склаў 64 працэнты валаво-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

га дахода, у 1970-м г. - 66 працэнтаў, у 1978 - 78 працэнтаў, у 1980 - 96 працэнтаў. Па выніках 1985 года больш адной трэцяй калгасаў выкарыстоўвалі на аплату працы 80 працэнтаў валавога даходу.

Арэнда садзейнічае ўзрастанню актыўнасці працоўных. Разам з тым распаўсюджванне арэнды праходзіць вельмі марудна. Тут ёсць многа праблем. Па - першае, арэндатар зацікаўлены да найбольш даходных галін вытворчасці. Па - другое, практыка многіх краін паказвае, што арэнда мае свае граніцы, за рамкі якіх нельга выйсці, не выкарыстоўваючы калектыўных форм працы.

Да цяперашняга часу яшчэ не пераадолен недавер да арэнды (асабліва сямейнай) у многіх кіраўнікоў саўгасаў і калгасаў. Пераход да новых форм уласнасці павінен ажыццяўляцца у дабравольным парадку. Больш таго, няма ўпэўненасці у тым, што арэнда не носіць часовы характар.

У сувязі з гэтым цікавымі з'яўляюцца некаторыя вынікі сацыялагічных даследаванняў, праведзеных АГН пры ЦК КПСС у пяці буйных раенах СССР у 1986, 1988, 1989 гг. Калі у 1986 г. 36 працэнтаў рабочых саўгасаў і калгасаў гаварылі аб прысутнасці у іх пачуцця гаспадара вытворчасці, то у 1989 г. такімі лічылі сябе на сваіх працоўных месцах - 48 працэнтаў, на вытворчым участку, у цэху, на ферме - 16 працэнтаў, на прадпрыемстве - 13 працэнтаў. Па даным таго ж сацыялагічнага даследавання найбольш прадукцыйным шляхам злучэння селяніна з зямлей з'яўляецца арэнда. Сярод тых, хто перайшоў на яе (каля 16 працэнтаў), вышэй дысцыпліна працы, актыўнасць і адказнасць. Каля 70 працэнтаў гаспадарчых кіраўнікоў і 65 працэнтаў працоўных лічылі карысным развіцце арэндных адносін. Але калі судзіць па адказам, для многіх працоўных вескі арэндная практыка яшчэ не з'яўляецца прывабліваю: толькі 25 працэнтаў праявілі жаданне перайсці на гэту форму працы, 42 працэнты не змаглі выказаць да гэтай формы працы сваіх адносін, каля 60 працэнтаў лічаць, што поспех грамадска-эканамічных пераутварэнняў на весцы залежыць ад адміністрацыі.

Складанасці, якія узнікаюць у працэсе ўвядзення новых форм уласнасці, астаткі адміністрацыйнага стыля кіравання, нездавальненне марудымі тэмпамі ажыццяўлення эканамічнай рэформы выклі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калі да жыцця у СССР стачкі. Із аналіза стачак, якія адбыліся у канцы 1987 – першай палавіне 1989 гг. (не уключаючы сюды стачак шахцерау у ліпені 1989 г.), вынікае, што стачкі узнікалі у сувязі з незадавальняючым становішчам: аплаты працы – у 20-ці выпадках, арганізацыі працы – у 11-ці выпадках, умовах працы – у 8-мі выпадках, значна (у два і больш разы) меньш забастовак адбылося з-за недэмакратычных метадау кіравання і з-за марудных тэмпау перабудовы на прадпрыемствах.

Аналіз стачак можна было б прадоужыць на прыкладзе выступлення шахцерау. Красавіцкае (1991 г.) павышэнне цэн выклікала стачкі у г. Мінску і у другіх гарадах Беларусі. Прыклады з'яуляюцца сведчаннем таго, што і у цяперашніх умовах існуе адчуджальнасць паміж асобай і грамадствам. Фенамен адчуджальнасці перашкаджае не толькі працоунай творчасці, але дае знаць пра сябе і у другіх сферах грамадства. Для павышэння актыунасці у працоунай творчасці неабходна узвышэнне чалавека працы, пераутварэння чалавека з прыдатка да рашэння вытворчых задач у суб'екта вытворчасці. На мой погляд, змяншэнне адчуджальнасці немагчыма без ажыццяулення:

па-першае, узвышэння чалавека у сістэме вытворчасці, пабольшвання ступені свабоды чалавека працы;

па-другое, змянення месца чалавека працы у сістэме вытворчых і грамадскіх адносін.

Узвышэнне асобы у сістэме вытворчых адносін немагчыма без пераадольвання адчуджальнасці чалавека працы ад грамадскай уласнасці, таму што адчуджальнасць ад уласнасці аказвае уплыу на адносіны абмена, размеркавання і іншыя.

Існуюць ілжывыя формы арганізацыі працы. Да апошніх можна аднесці актыунасць шлюбных аферыстау, прадаукоу наркоцікау, карцежных шулерау.

Удасканаленне вытворчых адносін садзейнічае пабольшванне ступені свабоды у працоунай дзейнасці, развіццю асобы, дэмакратызацыі грамадства. Працоуная творчасць немагчыма без суб'ектыуных пажаданняу. З другога боку праца, навязаная чалавеку, устаноуленыя стандарты значна зменшваюць гарызонт творчасці чалавека.

Удасканаленне форм уласнасці – не толькі комплекс мерапрыемствау для паляпшэння эканомікі, але і спосаб абароны чалавека

працы ад грамадскіх сіл, якія могуць выступаць супраць чалавека працы. Многія цяперашнія дзяржаўныя акты садзейнічаюць удасканаленню грамадскага кіравання. Удасканаленне грамадскага кіравання. Каардынацыя кіравання паміж гаспадарчымі і грамадскімі арганізацыямі сталі асабліва актуальнымі ў сувязі з дэмакратызацыяй грамадства. Адміністрацыйна-камандны стыль кіравання скоўваў асобу як суб'екта грамадскага працэсу. Названыя працэсы дэфармавалі прафесійныя і духоўныя якасці асобы. Распрацоўка праблемы самакіравання будзе садзейнічаць удасканаленню вытворчых адносін, фарміраванню актыўнай асобы, пераадольванню адчуджэння, павышэнню адказнасці за прынятыя рашэнні.

Якім чынам магчыма станаўленне самакіравання? Які можна прапанаваць грамадскі механізм які садзейнічаў бы гэтаму працэсу? Трэба ў першую чаргу пачынаць з эканамічнай сферы грамадства. Неабходна каардынацыя асабістых і грамадскіх інтарэсаў. Гэта магчыма, на мой погляд, шляхам пашырэння правоў працоўных калектываў, узрастаннем ступені эканамічнай свабоды і дэмакратыі. Змены ў грамадстве ўжо прапанавалі новыя элементы ў кіраванні: ад выбару кіраўнікоў прадпрыемстваў да ўдасканалення выбарчай сістэмы. Дэмакратыю ў працоўных калектывах трэба пашыраць: даць ім права не толькі выбіраць сваіх кіраўнікоў, але і вырашаць іх колькасць. Вызваблджаныя ад вытворчай дзейнасці кіраўнікі павінны мець эканамічную залежнасць ад таго калектыву, які выдзеліў іх на кіруючыя пасады.

Як гэта можна зрабіць на практыцы? Брыгада, напрыклад, вызначае ці патрэбен ей вызвабаджаны брыгадзір. Планы вытворчых калектываў каардынуюцца з цэнтралізаваным кіраваннем. Колькасць кіраўнікоў павінна быць з улікам думкі тых, хто працуе ў той ці другой сферы вытворчасці. Калі мы пачалі прыклад з брыгады, то можна развагі прадоўжыць да цэха, завода, да кіраўнікоў таго ці другога віда вытворчасці. На ўзроўні цэха вызначаецца колькасць вызваблджаных кіраўнікоў, патрэбных для усіх брыгад цэха і для цэха. Далей, на ўзроўні завода вызначаецца колькасць кіраўнікоў, патрэбных для брыгад, цэхаў і завода ў цэлым.

Дэмакратычны спосаб прыняцця кіруючых рашэнняў, эканамічная адказнасць за іх пры такім падыходзе будуць супадаць. Па-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трэбен і улік матэрыяльных сродкаў і людскіх рэсурсаў на ўтрыманне арміі, медыцынскага абслугоўвання, адукацыі і г.д. Але і пры такім падыходзе не рашаюцца два пытанні і: па-першае, як рашыць супярэчлівасць паміж дэмакратызмам у прыняцці кіруючых рашэнняў і кампетэнтнасцю, па-другое, ці можа працаваць прапанаваны механізм у духоўнай сферы і палітычнай сферах?

Праблема працоўнай творчасці асобы - прадаўжэнне праблемы ўзаемаадносін грамадства і асобы. Першая і другая праблемы сваімі каранямі ўваходзяць у вытворчыя адносіны.

Прапанаваныя варыянты самакіравання народа дазваляюць пераутварыць асобу працоўнага з аб'екта грамадскага кіравання ў суб'ект. Праўда, гэта немагчыма без дзейнасці самой асобы.

Для пераўтварэння чалавека працы ў суб'екта гістарычнага развіцця патрэбны і аналіз ужо вядомых метадаў кіравання. Цікавыя ідэі ў 20-е гады былі выказаны А.Гостевым. У самым агульным выглядзе яго праграма заключалася ў наступным:

1. Навуковае вызначэнне элементаў вытворчага працэса;

2. Вызначэнне таго самага ў працоўным працэсе;

3. Вызначэнне законаў анатоміі вытворчага працэса;

4. Аналіз законаў вытворчасці - раздзяленне вытворчасці і раздзяленне працы;

5. Сінтэз гэтых законаў - злучэнне кампазіцыі і кааперацыя працы;

6. Генезіс форм вытворчасці;

7. Працоўная тэхналогія прафесій у адпаведнасці з гэтымі формамі;

8. Фарміраванне установак працаўніка;

9. Выхаванне новага тыпа працаўніка.

Другімі словамі, на фарміраванне чалавека новага тыпу аказваюць уплыў як вытворчасці так і грамадскія працэсы. А.Гостеў быў адзін з першых, хто звярнуў увагу на культуру працы як важны элемент у сістэме культуры.

Падводзячы вынікі можна зрабіць вывад, што ў працэсе станаўлення асобы як суб'екта працы, суб'екта вытворчасці, суб'екта гістарычнай творчасці, на мой погляд, немагчыма без:

1. перабудавання адчуджання;

2. існавання розных форм уласнасці, якія змяняюць месца чалавека ў сістэме грамадскай вытворчасці, што будзе садзейні-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чаць пераадольванню адчуджэння ад "нічыйнай уласнасці";

3. ператварэнню працоўнай актыўнасці ў маральную рысу асобы;

4. змяненне структуры грамадскага кіравання, або станаўлення першых срокаў да самакіравання, якое немагчыма без дэцэнтралізацыі;

5. фарміравання гаспадара вытворчасці, таму што сацыялагічныя даследванні паказваюць, што думка працаўнікоў аб кіруючым апараце ў большасці выпадкаў адмоўная;

6. уліку супярэчнага адзінства традыцый і навацый у працоўнай творчасці;

7. павышэння культуры працы.

Аналіз працэса фарміравання асобы як суб'екта грамадскага працэса праз, у першую чаргу, працоўную творчасць, паказвае, што ператварэнне асобы з аб'екта працы і вытворчасці ў суб'ект працоўнай творчасці, а тым самым і суб'ект грамадскага прагрэсу. Пераадольванне адчуджальнай працы магчыма на шляхах удасканалення вытворчых адносін, якія могуць садзейнічаць пераадольванню адчуджэння ад зямлі, ад сродкаў вытворчасці, ад вынікаў працы, ад палітыкі, ад культуры. Названы працэс будзе садзейнічаць пераадольванню такіх псіхалагічных рысаў асобы як канфармізм, абыякавасць да грамадскіх спраў.

Фарміраванне асобы як суб'екта грамадскага прагрэсу прадугледжвае выхад асобы за рамкі вытворчасці адносін – ператварэнне асобы ў суб'ект не толькі вытворчасці, але і суб'ект грамадскіх адносін.

## ЛІТАРАТУРА

1. Ануфриев Е.А. Социальный статус и активность личности. – МГУ, 1984, с.201.
2. Американская социология. Перспективы, проблемы, методы. – М., 1982, с.180.
3. Смирнов В.А. Социальная активность советских рабочих. (Некоторые методологические и социологические проблемы). – М: Политиздат, 1979, с.25.
4. Нарский И.С. Отчуждение и труд. По страницам произведений К.Маркса. – М.: Мысль, 1983.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Тихомиров Ю.А. Демократия и экономика. - М.: Советская Россия, 1988, с.50.
6. Известия ЦК КПСС, 1989, № 5, с.297.
7. Научно-технический прогресс и творческий потенциал человека. - Киев: Навукова думка, 1988, с.25.
8. Социальная сфера: преобразования условий труда и быта. - М.: Наука, 1988, с.7.
9. Ципко А. Человек не может изменить своей природе. Политическое образование, 1989, № 4, с.69.
10. Там же, с.75.
11. Моторина Л.Е. Диалектика общественного и индивидуального сознания в развитии личности. - Философские науки, 1989, № 3, с.102.
12. Аргументы и факты. - № 27, 1989.
13. Там же.
14. Тюрина А. Оскуднение деревни: видеть истинные причины. - Политическое образование, 1989, № 9, с.81.
15. Чернышева А. Остановлено ли "раскулачивание"? - Аргументы и факты, № 30, 1989.
16. Там же.
17. Назимова А. Человек: конфликт на производстве. - Политическое образование, 1989, № 10, с.79.
18. Чаянов А. Основные идеи и формы организации крестьянской кооперации. - М., 1919, с.19.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Б.И.Броновицкий, А.А.Маркевич
(кафедра иностранных языков)

## ЛИНГВОКУЛЬТУРНАЯ ОСНОВА ПРЕПОДАВАНИЯ ИНОСТРАННОГО ЯЗЫКА

Элементы национальной культуры находят выражение в языке, ибо культура неотделима от человеческого общества. "Культура определяется как весьма сложный комплекс представлений, организованных в кодекс отношений и ценностей: традиций, религии, законов, политики, этики, искусства - всего того, чем человек, где бы он ни родился, пропитан до самых глубин своего сознания